# СВАБОДА

НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА

№ 23 (38), 5–11.10. 2006 г.


# БЕЗ ПРАВА НА ДОБРЫ ЛЁС

"Закон перамог міласэрнасць" — так італьянская прэса ацэньвае рашэнне выслаць у Мінск дзесяцігадовую сірату з Беларусі, якой некалькі месяцаў апекавалася сямейная пара ў Генуі.

Віка Мароз, якая выхоўвалася ў школе-інтэрнаце ў Вілейцы для дзяцей з праблемамі маўлення й слыху, некалькі год запар у рамках дабрачыннай праграмы прыязджала на летнія канікулы ў Італію. Там яе выхаваннем займалася сямейная пара Алясандра Джуста і Марыя Барначын, якія звярнуліся да беларускіх уладаў з просьбай аб удачарэнні Вікі. Аднак вырашыць гэтае пытанне цягам гадоў не ўдавалася з-за бюракратычных перашкодаў.

Гэтым разам Алясандра і Марыя звярнулі ўвагу на дзіўныя гульні дзяўчынкі з лялькамі – яна іх звязвала вяроўкамі, а потым пачынала цалаваць. Італьянскія газеты абыйшоў малюнак Вікі, якая намалявала сябе прывязанай да крэсла.

"Мы вырашылі, што не можам адправіць яе назад у дзіцячы дом. Ёй нельга вяртацца ў гэтае пекла", — распавёў журналістам Алясандра Джуста.

Лекары, якія правялі агляд, пацвердзілі, што сінякі, крывавыя пацёкі і апёкі на целе дзяўчынкі ёсць сведчаннем катаванняў, а магчыма, і сэксуальнага гвалту над ёй у вілейскім інтэрнаце.

Спачатку грамадзянскі суд у Генуі даў дазвол апекунам на працяг побыту Вікі ў Італіі на два месяцы, але пасля ўмяшання пасольства РБ, пастанавіў выслаць дзяўчынку дамоў.

Тады Джуста і Барначын вырашылі схаваць Віку ад беларускіх дыпламатаў і італьянскай паліцыі. На некалькі месяцаў прытулкам ёй стаў бернардзінскі кляштар у Сент-Уаене на італьянска-французскай мяжы. Як распавядала жанчына, якая апекавалася Вікай, "яна малявала схемы свайго інтэрнату і месцы, дзе будзе хавацца". І дзе прыёмныя бацькі павінны будуць яе знайсці…

Афіцыйны Мінск абвінаваціў Італію ў выкраданні дзяўчынкі і звярнуўся ў Інтэрпол. Адначасова была замарожаная праграма паездак дзяцей з Беларусі ў Італію на адпачынак (каля 25 тысяч чалавек).

**Працяг на стар. 3**



*Гэты малюнак Вікі Мароз — дзяўчынка, прывязаная да крэсла — гэтымі днямі абышоў многія друкаваныя выданні свету. Італьянскія лекары-эксперты кажуць, што зроблены малюнак пад уплывам успамінаў Вікі пра яе жыццё і пакуты ў школе-інтэрнаце ў Вілейцы. Італьянскі лекары, якія прыляцелі разам з Вікай у Беларусь, паведамілі, што з часу вяртання ёй удалося даць «толькі бутэлечку» кока-колы. Афіцыйныя ўлады, якія дамагліся вяртання сіраты з Італіі ў Беларусь, лічаць, што тут ёй будзе лепш. Фота з сайта Human Rights House.*

## ШТО БУДЗЕ , КАЛІ ЗАЎТРА НЕ СТАНЕ ЛУКАШЭНКІ?

► СТАР.2

## БЕЛАРУСЬ НЕ ХОЧА ЗМАГАЦЦА З ГРУЗІНАМІ

► СТАР.5

# ШТО БУДЗЕ Ў БЕЛАРУСІ, КАЛІ ЗАЎТРА НЕ СТАНЕ ЛУКАШЭНКІ?

**АЛЕСЬ АНЦІПЕНКА, ФІЛОСАФ:**

## “МОЖА ПАЧАЦЦА ХАОС”

Паколькі ў Беларусі не існуе законнай пераемнасці ўлады, знікненне кіраўніка краіны прывядзе да спробаў неканстытуцыйнага захопу той самай улады. І ўтрымання той самай сістэмы і таго самага рэжыму, які існаваў дагэтуль. Калі праз нейкі час, нарэшце, не ўзнікне сітуацыя, якая зробіць магчымымі дэмакратычныя выбары. Яшчэ адзін варыянт: калі не знойдзецца моцнай асобы, якая зможа захаваць цяперашнюю сістэму ўлады, тады папросту пачнецца хаос. Пачнецца перадзел улады. Сёння беларуская эканоміка з’яўляецца дзяржаўнай, і любыя спробы перадзелу кантролю над інфраструктурай прывядуць да дэзарганізацыі. А гэта дасць шанец аўтарытарным папулістам ізноў прыйсці да ўлады.

**ІГАР, ЛЕКАР:**

## “ТОЛЬКІ НЕ ЗАЎТРА!”

Толькі не заўтра! Хай яшчэ сядзіць гадоў пяць. Кажу гэта пры ўсёй маёй нелюбові да гэтага чалавека. Бо знікні ён заўтра, мы ўсе апынемся ў вельмі незайздросным становішчы. Апазіцыя яшчэ заслабая, каб штурмаваць уладу. А ўлада, што застанецца без яго нагляду, занадта неамбіцыйная, каб супрацьстаяць Крамлю. А ў Масквы ў такой сітуацыі хопіць і сродкаў, і хітрасці, каб без усялякіх рэферэндумаў прысабечыць сабе ўсё, што ёй тут спадабаецца. І МАЗы з БелАЗамі, і газавыя трубы з банкамі. Пакінуўшы нам стары гімн і БТ.

**ІРЫНА ПІСЬМЕННАЯ, КІНАРЭЖЫСЁР:**

## “АПАЗІЦЫЯ ВЕЛЬМІ РАЗГУБІЦЦА”

Я думаю, што вельмі разгубіцца апазіцыя. Таму што нарэшце трэба будзе нешта рабіць. А нешта рабіць, як мы бачым, яны не надта могуць. Яны скажуць: як усё хутка адбылося! Хай бы ён яшчэ адзін тэрмін пабыў, тады б мы былі гатовыя. Па-другое, прыхільнікі Лукашэнкі, я думаю, наладзяць на плошчы майдан, каб дамагацца чарговага Лукашэнкі. А апазіцыя, гэта будзе іх першая добрая справа, паставіць ім біятуалеты. Каб яны хоць тут не былі быдлам. Што тычыць мяне, дык я буду спяваць песні і здымаць фільмы пра каханне. Каб людзі, нарэшце, іх убачылі.

**МАРЫЯ, НАСТАЎНІЦА:**

## “ПАДБЯРУЦЬ ЯМУ ЗАМЕНУ НА КАСТЫНГУ”

Усё будзе так, як сёння. Нічога не зменіцца. Замест Лукашэнкі будзе чарговы калгаснік. Знойдуць падобнага. Падбяруць на патаемным кастынгу, каб падобны быў знешне. І размаўляў гэтак жа, як Лукашэнка. А народ наш прыглыне ўсё, што яму падсунуць. Абы ціха было.

**ГЕОРГІ ЛІХТАРОВІЧ, ФАТОГРАФ:**

## “БУДУЦЬ СТВАРАЦЬ КЛОН ЛУКАШЭНКІ”

Вядома, хацелася б, каб адразу ўсё стала, як у людзей. Усе загаварылі па-беларуску. Дзеці пайшлі ў беларускія школы. Беларуская мова запанавала ва ўладных кабінетах. Усё стала, як ва ўсіх нармальных краінах. Але справа не толькі ў Лукашэнку. Ён стварыў сістэму, якая вывела своеасаблівую “эліту”. Шэрасць і бяздарнасць. І сам Лукашэнка ў гэтай сістэме нічога новага не вынайшаў. Бо ўсё гэта было ў Саюзе ССР. Гэта тая ж самая сістэма, якая была пры Леніне і Сталіне. І вось гэтая шэрая эліта зубамі будзе трымацца за свой лад жыцця. Не за ідэі, а за пайкі. Таму з адыходам Лукашэнкі ўвадначассе нічога не зменіцца. Бо сістэма фальсіфікацый і маніпулявання народным волевыяўленнем адладжаная дасканала. І яны будуць ствараць клон Лукашэнкі. Наступнага правадыра.

**ІЛЛЯ, ГАНДЛЯР:**

## “БУДЗЕ ВЯЛІКАЯ БОЙКА”

О! Гэта будзе такі крызіс і збой! Мала не падасца. Бо Лукашэнка – сістэмаўтваральная асоба. Цвік, на якім усё трымаецца. І заводы, і банкі, і аграгарадкі, і дзіцячыя садкі з выцвярэзнікамі. Але галоўнае – гэта псіхалагічны цвік, які сядзіць у галаве ледзь не кожнага беларуса. Плітку паклалі – бацька клапоціцца. Пенсію выплацілі – бацька са сваёй кішэні падзяліўся. Вада гарачая з крана ідзе – бацька яе сагрэў. Усе астатнія асобы, што ўрадоўцы, што апазіцыя – толькі перашкаджаюць клапатліваму бацьку. І вось бацькі няма. А ёсць вялікая бойка паміж “магілёўскімі” і “гомельскімі” за пасады і, галоўнае, за прэзідэнцкі фонд і дзяржаўную маёмасць. І пакуль будзе працягвацца гэтае свінства, могуць пачацца затрымкі заробкаў і пенсіяў. І Лукашэнку “простыя людцы” будуць успамінаць амаль як святога. Але гэта будзе ў першай серыі канцэрта. А што будзе ў другой, прадказваць не бяруся. Думаю, сумна не будзе.

**РЫГОР СІТНІЦА, МАСТАК:**

## “АПАЗІЦЫІ ТРЭБА БУДЗЕ ДАМАЎЛЯЦЦА З УЛАДАЙ”

Усе мы ходзім пад Богам. І ўсё можа здарыцца. Але ў гэтым выпадку мы не адразу пра гэта даведаемся. Інфармацыя прасочыцца з той установы, якая старанна будзе хаваць інфармацыю ад нас. Чуткі адразу пачнуць распаўзацца па краіне. Напрыканцы дня на плошчы Каліноўскага пачне з’яўляцца новае намётавае мястэчка. Яно будзе ў дзясяткі разоў большае за тое, што было ў сакавіку. Сярод прысутных на плошчы мы заўважым шмат людзей, якіх мы ніколі не чакалі там убачыць. Тым не менш, сілы плошчы ўсё роўна будзе недастаткова, каб змесці старыя ўладныя структуры. Трэба сказаць, што сярод людзей улады шмат такіх, для каго перамены азначаюць сур’ёзныя наступствы ў іхным асабістым лёсе. Гэтыя людзі паспрабуюць скарыстаць сітуацыю для ўвядзення надзвычайнага становішча. Я думаю, што пад ціскам плошчы лідэры апазіцыі павінны будуць прапанаваць уладзе мірныя перамовы для далейшага ўзаемадзеяння. Бо сярод урадоўцаў ёсць шмат нармальных людзей, якія не захочуць сядзець на лаве падсудных. Сярод нашых апанентаў дастаткова разумных людзей, якія не ўяўляюць сябе без Бацькаўшчыны. І трэба ўзаемаразуменне з імі знаходзіць.

**ЗІНАІДА, ПЕНСІЯНЕРКА:**

## “ТРАГЕДЫІ НЕ БУДЗЕ”

Я памятаю, як памёр Сталін. Мне, тады піянерцы, здавалася, што жыццё сканчаецца. Бо як можна далей жыць? Смяяцца, як раней, хадзіць у школу, гуляць? Але жыццё не спынілася. Яно стала лепш. Усё, што здараецца, яно да лепшага. Таму і адыход Лукашэнкі таксама не будзе трагедыяй. Незаменных людзей няма.

**Працяг у наступным нумары.**

# БЕЗ ПРАВА НА ДОБРЫ ЛЁС

**Працяг са стар. 1**

Пад ціскам РБ італьянская паліцыя распачала вышук і 27 верасня знайшла дзяўчынку. Італьянская пракуратура вырашыла не чакаць вынікаў апеляцыйнага суду ў Генуі і выслала Віку да яе "законных апекуноў" у Беларусі.

Алясандра Джуста заявіў, што яму крыўдна за Італію, якая "прагнулася перад дыктатурай".

Дзе зараз апякуюцца Вікай – дакладна невядома. Афіцыйныя СМІ паведамляюць, што яна ў адным з інтэрнатаў Мінскай вобласці – магчыма, у Барысаве. Міністр адукацыі РБ Радзькоў не выключае, што Віку змогуць удачарыць Джуста і Барначын. Але італьянская прэса выказвае сумнеў у праўдзівасці словаў беларускага чыноўніка.

**Паводле замежных СМІ**

P.S.

Гісторыі Вікі Мароз была прысвечаная праграма 1-га каналу расійскага тэлебачання "Хай гавораць", якая транслюецца ў Беларусі. Калі стала ясна, што сімпатыі публікі і амаль усіх удзельнікаў перадачы, за выключэннем чыноўнікаў з Беларусі, на баку яе прыёмных бацькоў з Італіі, трансляцыя была фактычна спыненая за дваццаць хвілін да заканчэння праграмы. Замест гэтага ў эфіры дэманстравалася рэклама.



## Скандалы і чуткі

# БЯСПЕКА ЛУКАШЭНКІ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ФІРМЫ "КРАЙСЛЕР"?

Для ўзмацнення аховы кіраўніка дзяржавы нядаўна былі набытыя новыя аўтамабілі Крайслер-300С з аб'ёмам рухавіка 5,7 літра. (Рынкавы кошт такога аўтамабіля складае прыкладна 60 тысяч еўра). Машыны, што й казаць, магутныя, рухавыя і звышнадзейныя. Адна праблема – запчасткі да гэтых амерыканскіх дарожных "монстраў" можна набыць толькі за мяжой, бо ў беларускіх дылераў іх пакуль няма. Так што, напэўна, давядзецца прэзідэнцкім ахоўнікам у блізкім часе ехаць па неабходныя дэталі для сваіх аўто ў… суседнюю Польшчу, на фірмовы склад. Рабіцца гэта будзе, зразумела, неафіцыйна, без лішняга шуму. Цікава, ці ўведаюць польскія дылеры, якога кліента абслугоўваюць?

Між тым, у акцыянерным таварыстве Аўтамабільны дом "Энергія", якое афіцыйна прадстаўляе кампанію Даймлер-Крайслер у Беларусі, працягваецца комплексная фінансавая праверка, распачатая некалькі тыдняў таму. Праверкі з удзелам самых розных кантрольных арганізацый – ад падатковых органаў да Камітэту дзяржкантролю — праводзяцца і ў іншых кампаніях, якія гандлююць імпартнымі аўтамашынамі і запчасткамі да іх. Пры гэтым адна камісія няспынна змяняе другую, як на канвееры, — з мэтай здабыць хоць якія-небудзь факты парушэнняў.

Існуе версія, паводле якой каманда праводзіць комплексную праверку дылераў паступіла зверху – пасля таго, як у адной аўтафірме не паспелі ў час адрамантаваць машыну дзяржаўнага сакратара Рады бяспекі РБ Віктара Шэймана. Што ж, бяспека краіны — рэч нежартоўная.

**Ул. інф.**



**Крайслер 300С**. *Фота* www.major-chrysler.ru

## Суседзі

# ДУДАЕВЫ СТАНУЦЬ ЭСТОНЦАМІ

Сям'я Джахара Дудаева ў блізкім часе можа пераехаць у Эстонію. Дудаевы падалі ў міністэрства народанасельніцтва гэтай краіны дакументы на атрыманне эстонскага грамадзянства, і неўзабаве іх хадайніцтва будзе перададзена ва ўрад.

Звычайна Эстонія дае сваё грамадзянства за асаблівыя заслугі раз на год, перад Калядамі. Перад Калядамі атрымаюць грамадзянства і Дудаевы, — піша газета Eesti Paevaleht. Сёлета ўпершыню грамадзянства можа быць нададзена асобе, якая ў Эстоніі не жыве. Адпаведныя змены былі ўнесены ў закон галоўным чынам дзеля Дудаевых.



**Ала Дудаева**

Міністр народанасельніцтва Эстоніі Аарне Веэдла ўдакладніў, што пра грамадзянства просяць удава Джахара Дудаева Ала і яе дзеці. Цяпер усе яны жывуць у Вільні. Прычына, дзеля якой Эстонія павінна даць грамадзянства за асаблівыя заслугі, — актыўны ўдзел Дудаевых у працы Арганізацыі непрадстаўленых народаў і дзейнасці Інстытута правоў народаў.

Генерал Дудаеў у канцы 1980-х служыў камандзірам авіяцыйнай дывізіі, якая базавалася ў эстонскім горадзе Тарту. Ён таксама займаў пасаду начальніка Тартускага гарнізона. Пазней Дудаеў стаў першым прэзідэнтам непрызнаванай чачэнскай рэспублікі Ічкерыя, а 21 красавіка 1996 году быў забіты ракетай, пушчанай з расійскага самалёта.

**Ул. інф.**

# “КАЛІ ДЗЕЙНІЧАЦЬ У ПАЛІТЫЦЫ ВЫКЛЮЧНА ПАВОДЛЕ ЗАКОНУ, ТО ВАРТА СХАВАЦЦА Ў ПАДВАЛЕ”

## АДКАЗЫ АЛЯКСАНДРА МІЛІНКЕВІЧА НА ПЫТАННІ СЛУХАЧОЎ РАДЫЁ СВАБОДА

**Спадзяюся, мы ўбачым вас 31 снежня па тэлевізары побач з елкай...**

Дзякуй за такі аптымістычны прагноз. Я таксама аптыміст, і даю гэтай уладзе пратрымацца пару гадоў, можа год. Але ўсё будзе залежаць толькі ад нас. Няма чаго чакаць, што раптам цэны падымуцца, абваліцца эканоміка, і мы ўедзем на белых канях. Мы мусім усе разам працаваць. Калі на плошчы нас будзе 100-200 тысяч, да гэтага трэба рыхтавацца. Без плошчы мы ніколі не абыграем дыктатуру.

**Як вы ставецеся да Анатоля Лябедзькі? Ці не здаецца Вам, што гэты чалавек намагаецца заняць ваша месца? Такія высновы я зрабіў пасля таго, як прачытаў шэраг артыкулаў на сайце АГП, якія вельмі асуджаюць дзеянні АДС і асабіста Вас?**

Канкурэнцыя паміж палітыкамі заўсёды ёсць, барацьба за лідэрства – гэта натуральная справа. Анатоль Лябедзька – сур’ёзны палітык з досведам, мае шырокую падтрымку. Таму я не лічу, што наша барацьба за лідэрства – гэта штосьці несумленнае.

Што тычыцца крытыкі кааліцыі, то я сам першы крытык, хаця і з’яўляюся старшынём Палітычнай Рады. Лічу, што яна згубіла страшна шмат часу, і не здолела арганізаваць дзеянні. Таму я бяру на сябе адказнасць за арганізацыю Руху «За Свабоду».

**А што будзе далей? Ладна, сепаратысцкія тэндэнцыі, але ці выпрацавана хаця б нешта, па чым будзе жыць беларуская апазіцыя далей? Вясна 2006 скончылася... а што за ёй?**



**Аляксандр Мілінкевіч**. *Фота з сайта www.milinkevich.org*

Мне б таксама хацелася, каб кожная акцыя, якую мы арганізуем, была больш шматлікая. Але так не заўсёды – пасля выбараў ёсць непазбежны спад энергетыкі, і не так лёгка людзей выводзіць на вуліцу. Але гэта залежыць ад кожнага з нас, ад усіх актывістаў.

**Як мы зможам змагацца за Новую Беларусь, калі прымуць змены ў некаторыя законы па выбарах? Нас пазбавілі выбару. Ён толькі адзін -- байкот. Не заклікайце да байкоту, бо за гэта прадугледжана пакаранье, трэба знайці нейкі выхад.**

Я ўжо перастаў баяцца пакаранняў, бо калі дзейнічаць у палітыцы выключна паводле закону, то варта схавацца ў падвале і не выходзіць на вуліцу. Але лічу, што байкот – гэта неэфектыўны інструмент, і патлумачу, чаму. Калі мы заклікаем людзей да чагосьці, мы павінны разлічваць, што большасць нас падтрымае. У справе байкоту мы заўсёды будзем у меншасці – людзей прымусяць прыйсці. Трэба заклікаць да рэальных рэчаў, якія можна рэалізаваць.

Нас сапраўды пазбавілі права выбіраць. Сёння ў нашай краіне ўлада нелегітымная, і змяніць яе выбарамі немагчыма. Яшчэ раз кажу, што ў стратэгіі дэмакратычных сілаў галоўная мэта – гэта вуліца. Падкрэсліваю – мірная вуліца, без радыкальных дзеянняў, але вуліца – адзіная наша магчымасць ліквідацыі рэжыму.

**Мой знаёмы пацярпеў пад час вясновых падзей. Ён згубіў працу. Да гэтага часу ён не можа нікуды ўладкавацца. Наконт дапамогі яму толькі абяцаюць, а насамрэч нічога не робіцца.**

Адна з галоўных нашых мэтаў – аказаць дапамогу рэпрэсаваным. Па студэнтах, што да нас звярнуліся, усе пытанні зняты, а што тычыцца людзей, звольненых з працы, то першая група — каля 70 чалавек — ад’язджае ў Польшчу на будоўлю, мы шукаем у вялікіх гарадах Беларусі дапамогу ў прадпрымальнікаў, каб іх працаўладкаваць. Будуць у нас магчымасці аказаць і разавую дапамогу. Але гэта няпростае пытанне, таму што настаўніка ў Польшчу ці Літву на працу не пашлеш. Галоўнае, каб анкета гэтага чалавека абавязкова была ў камітэце абароны рэпрэсаваных. Мы абяцалі і мы зробім усё, каб выканаць гэтыя абяцанні. Звяртайцеся на мабільны тэлефон 620 34 87.

**Калі б вы сталі прэзідэнтам, то які від спорту вы б развівалі?**

Я найперш даў бы волю бізнесу і эканоміцы, бо добры спорт ёсць толькі там, дзе ёсць вольны бізнес і добрая эканоміка. Я думаю, што не прэзідэнт павінен развіваць свае любімыя віды спорту, але ў нас ёсць выдатныя традыцыі, трэнеры, спартовыя школы, і гэтыя кірункі трэба развіваць. Усе ведаюць, мой любімы від спорту – баскетбол, але прымусу ў баскетболе не будзе, хаця ў нас ёсць і выдатныя традыцыі, мы маем нават алімпійскага чэмпіёна, Івана Едэшку.

**Вы з’яўляецеся кіраўніком палітычнай рады. Чаму Вы лічыце, што здолееце арганізаваць рух «За свабоду» па-за межамі палітрады?**

Я застаюся старшынём палітрады. Але яна, на жаль, за 6 месяцаў не змагла арганізаваць канкрэтную дзейнасць і далучыць тысячы новых людзей, што былі разам з намі ў час кампаніі. На жаль, палітрада займаецца гэты час у асноўным унутранымі разборкамі. Я не хачу далей чакаць, пакуль яна вырашыць гэтае пытанне. Аднак буду рабіць усё, каб паміж палітычнымі партыямі было супрацоўніцтва.

# МАСКВА ЗАКЛІКАЛА БЕЛАРУСЬ ПАДТРЫМАЦЬ САНКЦЫІ СУПРАЦЬ ГРУЗІІ

## АФІЦЫЙНЫ МІНСК ВЫГЛЯДАЕ АЗАДАЧАНЫМ

*Расійскі бок заклікаў Беларусь увесці візавы рэжым для грамадзянаў Грузіі. Аб гэтым 3 кастрычніка паведаміла інтэрнэт-выданне "Грузия-Онлайн". Што такія перамовы вядуцца, заявіў журналістам у Маскве намеснік кіраўніка Федэральнай міграцыйнай службы РФ Міхаіл Цюркін. Ён выказаў незадаволенасць сітуацыяй, калі "грамадзяне Грузіі прыбываюць у Беларусь, сядаюць на цягнік і прыбываюць у Расію".*



**Лідэры «рэвалюцыі ружаў»** *Міхаіл Саакашвілі (злева) і Зураб Жванія. Тбілісі, 23 лістапада 2003 году. Фота з архіву. (Прэм'ер-міністр Грузіі Зураб Жванія трагічна загінуў у лютым 2005 году. — заўвага рэд.)*

Ад пачатку тыдня Расія фактычна ўвяла поўную эканамічную блакаду Грузіі, перапыніўшы ўсе транспартныя і паштовыя сувязі з гэтай краінай. Таксама забаронена рабіць грашовыя пераводы з тэрыторыі Расіі ў Грузію. ( У Расійскай Федэрацыі, паводле прыблізных ацэнак, жывуць каля мільёна грузін. Насельніцтва самой Грузіі – 5 мільёнаў.)

Жорсткія санкцыі былі ўведзеныя, нягледзячы на тое, што Тбілісі выдаў РФ пры пасярэдніцтве АБСЕ чатырох расійскіх афіцэраў, затрыманых раней з абвінавачаннем у шпіянажы і дыверсійнай дзейнасці.

Выглядае, што для афіцыйнага Мінска просьба Міграцыйнай службы Расіі сталася нечаканасцю. Прынамсі, першая рэакцыя беларускіх чыноўнікаў з розных ведамстваў была супярэчлівай, што сведчыла аб некаторай разгубленасці. Першы намеснік начальніка дэпартамента грамадзянства і міграцыі МУС РБ Аляксей Бягун заявіў журналістам, што пытанне аб магчымасці ўвядзення візавага рэжыму з Грузіяй "ужо разглядалася". Паводле ягоных словаў, адпаведныя органы "адсочваюць сітуацыю і ўзаемадзейнічаюць з Расійскай Федэрацыяй у пытаннях, датычных перасоўвання грамадзянаў Грузіі транзітам праз Беларусь у Расію".

У той самы час прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Андрэй Папоў заявіў, што Расія афіцыйна не ставіла перад Беларуссю пытанне аб магчымасці ўвядзення візавага рэжыму ў адносінах да Грузіі.

Інтэрнэт-сайт "Беларускі партызан" у гэтай сувязі нагадаў, што яшчэ ў траўні 2005 году Аляксандр Лукашэнка даручыў падрыхтаваць рашэнне аб увядзенні такога рэжыму. Тады было заяўлена, што рашэнне «абумоўлена неабходнасцю працягнуць намаганні, скіраваныя на актывізацыю барацьбы з арганізаванай і транснацыянальнай злачыннасцю, абарону ў гэтай сферы інтарэсаў трэціх краінаў – суседзяў Беларусі згодна з існуючымі дамоўленасцямі". У прэс-службе кіраўніка дзяржавы заяўлялі "аб выкарыстанні грузінскімі крымінальнымі элементамі тэрыторыі Беларусі ў якасці каналу пранікнення на тэрыторыю РФ без адпаведных візаў". Як бачым, лексіка чыноўнікаў адміністрацыі кіраўніка РБ нічым не адрознівалася ад тае лексікі, якой карыстаецца афіцыйная Масква.

І Лукашэнка, і крамлёўскае кіраўніцтва не аднойчы выказвалі сваё негатыўнае стаўленне да мірных дэмакратычных пераўтварэнняў у былых савецкіх рэспубліках – да "аранжавай рэвалюцыі" ва Украіне, "рэвалюцыі ружаў" у Грузіі і г.д. Антыгрузінская прапаганда ў Беларусі дасягнула свайго апагею сёлета, падчас сакавіцкіх падзеяў у Мінску. Напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў асабіста старшыня КГБ заяўляў аб раскрыцці тэрарыстычнай змовы супраць беларускай дзяржавы. У заяве фігуравалі тады "дохлыя пацукі" (якімі змоўнікі збіраліся атручваць ваду), а таксама "амерыканскія і арабскія інструктары", якія трэніравалі беларускіх змоўнікаў на тэрыторыі Грузіі. Неўзабаве ў аэрапорце Мінск-2 былі затрыманыя і дэпартаваныя ў Грузію сем дэпутатаў грузінскага парламента, якія збіраліся ўдзельнічаць у назіранні за выбарамі. А пасля выбараў у спецпрыёмніку-размеркавальніку міліцыі на Акрэсціна апынуліся, поплеч з удзельнікамі пратэстаў на Кастрычніцкай плошчы, грузінскія журналісты, асуджаныя, як і некаторыя іншыя беларускія і замежныя іх калегі, "за хуліганства".

У той час чыноўнікі і дзяржаўная прэса прапагандавалі ідэю візавых абмежаванняў для грамадзянаў Грузіі. Здавалася б, зараз настаў зручны момант, каб ажыццявіць гэтую ідэю і адпомсціць ненавіснаму "рэжыму Саакашвілі", які адкрыта заяўляў пра падтрымку беларускай апазіцыі.

Але тыя ж самыя чыноўнікі, а таксама прэса неяк без энтузіязму ўспрынялі просьбу саюзніка. Відаць, гэтым разам адсутнічалі ясныя ўказанні з самага верху. Такой няпэўнай рэакцыі, насамрэч, можна было чакаць пасля нядаўняга выступу Лукашэнкі перад расійскімі журналістамі, у якім ён прыгразіў Маскве "поўным разрывам эканамічных адносінаў". На фоне абвінавачанняў Крамля ў імперскіх памкненнях і заяваў пра непахіснасць дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі адназначная падтрымка расійскіх санкцыяў супраць суверэннай Грузіі выглядала б, мякка кажучы, недарэчнай.

Зразумела, кіраўніку Беларусі і яго адміністрацыі не ўпершыню мяняць погляды ў залежнасці ад абставінаў, не ўпершыню казаць адно, а рабіць зусім іншае. Але ў дадзенай сітуацыі, выглядае, Лукашэнка адчувае сябе ў адносінах з Расіяй на вышыні становішча і можа дазволіць сабе позу: маўляў, вы мяне папрасіце, а я яшчэ пагляджу – ці дапамагаць свайму саюзніку. Адносіны з Грузіяй, як і з Украінай, як і з Захадам увогуле, становяцца дадатковай зброяй шантажу афіцыйнага Мінска супраць Масквы. Але калі гэта неяк дапаможа ў цяперашняй сітуацыі грузінам – ужо будзе няблага.

**Аглядальнік**

"Саюздрук"

# СЛЁЗЫ ЗАМІЛАВАННЯ АЛЬБО РАЗМЕТКА НА ДАРОГАХ

«Советская Белоруссия» на сваіх старонках працягвае палохаць чытачоў новымі "падкопамі", якія збіраецца рабіць апазіцыя. Гэтым разам СБ піша пра загадкавую дацкую недзяржаўную арганізацыю "Сілба".

*"Увидев перед собой стоп-сигнал в Беларуси, «Силба» развила активную деятельность с территории соседней Украины. На датские деньги в начале августа под Луцком был организован летний лагерь для более чем 60 представителей незарегистрированных организаций «Зубр», «Молодой фронт», «Отпор». На размышление наталкивает уже состав участников: все перечисленные молодежные группировки находятся в конфликте с законом. Но еще более сильное впечатление оставляет программа, разработанная для них. Политические дискуссии, направляемые опытными инструкторами в нужное русло, перемежевывались с усиленными занятиями по весьма специфической физподготовке.*

*Молодые люди совершали трехкилометровые марш-броски с полосой препятствий из колючей проволоки. Для них проводились специальные занятия, посвященные участию в массовых уличных акциях. Их обучали формировать трудноразрываемые цепи, ударные клинья наподобие рыцарской «свиньи». При этом тренеры и не скрывали, где именно их подопечные должны будут применить полученные навыки".*

Пасля прачытання такога тэксту настрой значна паляпшаецца. Хочацца верыць, што грошы заходніх падаткаплатнікаў не марнуюцца. Ёсць, аказваецца, замежныя семінары, дзе займаюцца не палітычнай балбатнёй, а чымсьці больш практычным.

Тым часам газета "Звязда" ў матэрыяле пра Белавежскую пушчу апісвае рэакцыю іншаземцаў, якія туды патрапілі ўпершыню:

*"Розніца паміж беларускімі турыстамі і іншаземцамі, канешне, ёсць. Апошнія стараюцца цалкам акунуцца ў прыроду, непасрэдна ўбачыць нейкую расліну, птушку, жывёлу, пешшу прайсціся па пушчы, зазірнуць у аддаленыя запаведныя куточкі лесу... Прычым зрабіць гэта няспешна, грунтоўна. Такія паводзіны абсалютна натуральныя: іншаземцы прыязджаюць да нас здалёк, нічога падобнага яны не толькі не маюць у сябе, але і нідзе ў іншым месцы не бачылі. А можа ўжо ніколі і не пабачаць... Відаць, таму белавежскі неруш, яго прыгажосць выклікаюць ва ўрбанізаваных еўрапейцаў такую буру эмоцый. І слёзы замілавання на іх тварах зусім не рэдкасць".*

Тая ж газета з замілаваннем піша пра эмоцыі іншых гасцей – расійскіх журналістаў, якія па асабістым запрашэнні Лукашэнкі прыехалі нахвальваць тое, што ім пакажуць у Беларусі.

*"Анатоль ЗЯМСКОЎ, намеснік галоўнага рэдактара газеты «Наша Пенза»:*

*"Асаблівыя пачуцці ў мяне выклікала тое, што адбываецца рэальнае адраджэнне беларускай вёскі. У нашым рэгіёне гаспадаркі разбураны, у глыбінцы нярэдка можна ўбачыць пустыя фермы і пакінутыя вёскі, дзе ўжо ніхто не жыве. Канешне, ёсць у нас і сучасныя жывёлагадоўчыя комплексы, аднак іх развіццё знаходзіцца на пачатковай стадыі. А ў Беларусі найноўшыя тэхналогіі ў аграпрамысловым комплексе атрымалі шырокае распаўсюджанне".*

*Алег СЛЮСАР, карэспандэнт газеты «Известия Удмуртской республики»:*

*"Надзвычай шмат уражанняў, адразу і сфармуляваць цяжка, трэба іх асэнсаваць. Мяркуйце самі: той факт, што ў Беларусі на звычайных вясковых дарогах ёсць спецыяльная разметка, пра многае гаворыць".*

Цікава, якую такую спецыяльную разметку ўбачыў госць з Удмурціі. Колькі ні езджу па беларускіх вёсках, разметка там самая звычайная. Дарожная. Для аўтамабіляў і пешаходаў. І асабіста мне гэты факт гаворыць толькі пра адно: ў Беларусі дзейнічаюць Правілы дарожнага руху. Ва Ўдмурціі, мабыць, такіх правілаў няма. А наконт кінутых вёсак і пустых фермаў… Іх сапраўды нельга ўбачыць у Беларусі праз вакно прэзідэнцкага аўтобуса. Для гэтага трэба, прынамсі, з аўтобуса выйсці.

**Алесь Канюціч**

Як робяцца хвалі

# АПАЗІЦЫІ – СВАБОДУ СЛОВА!

## У ЭФІРЫ ПАТРЭБНЫ ЖЫВЫЯ ІНТАНАЦЫІ

Ну вось і дачакаліся – аб'яднаная апазіцыя раз'ядналася. У панядзелак пачулі мы па радыё навіну: маўляў, Мілінкевіч будзе асабіста ствараць "рух за свабоду", і Лябедзька з Калякіным не будуць яму дапамагаць.

Не зразумела – чаго яны там не падзялілі? Але тут ужо прэтэнзія не толькі да самой апазіцыі, але й да журналістаў – чаму на нашым радыё няма палітычных дыскусій? Хай збяруцца палітыкі ды ў простым эфіры спрачаюцца паміж сабой, а мы самі будзем разбірацца, хто мае рацыю, а хто не. А то карэспандэнт перакажа словы Мілінкевіча, а голас самога палітыка прагучыць толькі адну секунду. Потым ізноў карэспандэнт сваім голасам будзе пераказваць, што заявіў Лябедзька, сам Лябедзька таксама толькі на секунду будзе дапушчаны да мікрафона, а беднаму слухачу застаецца толькі здагадвацца, у чым справа. Слухачу патрэбна дакладная інфармацыя – літаральна з першых вуснаў. Патрэбны жывыя інтанацыі, эмоцыі, акцэнты. Карацей кажучы, свабоду слова апазіцыі!

На Радыё Рацыя і на Радыё Свабода пачуў некалькі невясёлых навінаў пра лёс помнікаў архітэктуры – замак у Нясвіжы, касцёл у Глыбокім, будынкі ў Гродне. У той самы дзень чую па літоўскім радыё навіну з Коўна – на грамадскае абмеркаванне выстаўлены праект рэстаўрацыі ковенскага замка – кансервацыя рэштkaў, аднаўленне часткове альбо поўнае. Параўноўваючы гэтыя карэспандэнцыі з Літвы і Беларусі, міжволі задаешся пытаннем: а якой логікай кіруюцца чыноўнікі-ўладары у нас і ў іх? Мне здаецца, што чыноўнікі-бюракраты паўсюль аднолькавыя. Але што тады прымушае іхнага рупіцца пра помнікі, шукаць грошы для рэстаўрацыі, кансультавацца з грамадскасцю і спецыялістамі? Хай бы нашы журналісты запыталіся пра гэта ў нашых чыноўнікаў.

Моўныя заўвагі. Некалькі разоў ад розных людзей пачуў такія наватворы: "вахтар" замест звыклага "вахцёр", "валантэр" замест "валанцёр". Кіруючыся гэткім "сістэмным падыходам" трэба казаць: баксэр, шахтар, камбайнэр. Што пнём аб саву, што савой аб пень! Абодва словы "валанцёр" і "валантэр" – не беларускія. Калі ўжо старацца гаварыць чыста па-беларуску, тады трэба, мусіць, казаць замест "вахцёр" – "вартаўнік" ці "брамнік", а замест "валанцёр" – "дабраволец".

**Сяржук Вітушка**

Стрэмкі

# ДЛЯ КАГО ЗВОНІЦЬ ЗВОН

Неяк па радыё – не афіцыйным, вядома, — адзін малады хлапец абураўся пасіўнасцю беларусаў, якіх немагчыма ані вывесці на вуліцу, ані падбухторыць на страйкі ці іншыя формы пратэсту. Ды і ўвогуле згодны бясконца цярпець існуючы рэжым. Больш за тое – ім задаволены.

“То ці варта змагацца, ахвяраваць сабою для такога быдла” – роспачліва выгукнуў юнак.

“Народ такі” — тлумачаць многія.

Народ... Ці ёсць на свеце больш цьмянае і неакрэсленае паняцце? Сапраўды – што гэта такое? Вось, напрыклад, мастакі, навукоўцы, пісьменнікі, увогуле інтэлігенцыя, — народ? Не, яны “выйшлі з народа”. Незлічоная армія чыноўнікаў – вядома ж, не, наадварот: яны “п’юць народную кроў”. “Мі-лі-цы-я з на-ро-дам!” – марылі ўслых дэманстранты. То і міліцыя – не народ. Яна – або з ім, або – супраць. Палітыкі – о не, не! Зрэшты, яны адны ведаюць, хто такі народ: народ – гэта ўсе, хто думаюць так, як яны. Бамжы, крымінальнікі – не, гэта струпы і гнайнікі на народным целе. І так далей – нібы здымаеш адну за адной лушпайкі з цыбулі – застаецца пустка. Ды слёзы.

“Народная творчасць” – не было і не можа быць ніякай калектыўнай творчасці. Народ, як і ўсякі іншы калектыў, можа толькі падхапіць, абгладзіць, абтачыць штосьці, створанае канкрэтнай асобай. Усе “народныя” песні, усе казкі, прыказкі і прымаўкі мелі ў аснове канкрэтных, але даўно забытых аўтараў. Нездарма, як толькі стала фіксавацца ў найноўшыя часы аўтарства, не стала і “народнай творчасці”.

Існуюць яшчэ й такія акрэсленні – “большасць”, “масы”, “чэрнь”. “Паэт і чэрнь” – Пушкін. Або Пісараў – “страўнік чалавецтва”. Крыўдна? – пражывіце без страўніка.

Страўніку, аднак, не патрэбны ні Бах, ні Бетховен, ні Бергман. Ні паэзія, ні мастацтва. Дастаткова піва і футбола – у сэнсе глядзець, не гуляць. Ну і “папсы” яшчэ. Гэта “большасць” давяла да самагубства Ван-Гога і да заўчаснай смерці Таркоўскага ды безліч іншых творцаў.

“Бальшавікі” – вось “твар” большасці.

“Большасць” не нараджае ніякіх ідэй – ні светлых, ні цёмных. Большасць можа толькі імі захапіцца. Асабліва “большасці” даспадобы ідэі накшталт “перадавога класа” ці “юбер алес”.

Большасць вельмі лёгка ачмурыць і абдурыць. І як жа цяжка – асвяціць.

“Народ” ці “большасць” нельга ані любіць, ані ненавідзець. Гэтыя пачуцці могуць стасавацца толькі да канкрэтных асобаў.

Няма праблемы – “народ і дыктатура”.

Ёсць – “я і дыктатура”.

Калі ты пачуваешся эмігрантам ва ўласнай краіне – пратэстуй! Калі рэжым душыць і топча тое, што дорага не абстрактнаму “народу”, а канкрэтнаму табе – змагайся! Калі табе агідна маршыраваць, а тым больш думаць “у нагу” – ідзі сваёй дарогай! Абураюць махлярскія артыкулы ў рэжымным друку – пішы свае ў незалежны!

І ніколі не пытайся, для каго звоніць звон Свабоды. Ён звоніць для цябе.

**Алег Аблажэй**




**Каля кіёска** *«Саюздруку». Мінск, кастрычнік 2006 году.*

# Невядомая Беларусь

**5 кастрычніка** 1796 году нарадзіўся граф Міхаіл Мураўёў, шэф расійскай каланіяльнай адміністрацыі ў Беларусі, які праводзіў жорсткую палітыку русіфікацыі ва ўсіх сферах жыцця і “праславіўся” расправай з паўстаннем за незалежнасць пад кіраўніцтвам Кастуся Каліноўскага, за што атрымаў у народзе мянушку “Мураўёў-вешальнік”.

**6 кастрычніка** 1876 году прыйшоў на свет Ян Булгак – класік беларускай фатаграфіі. Родная вёска Булгака – Асташына ў цяперашнім Навагрудскім раёне. Дзякуючы Булгаку, да нашага часу дайшлі выявы беларускіх людзей, вёсак і гарадоў, якіх даўно няма ў рэальнасці.

**7 кастрычніка** 1765 году нарадзіўся беларускі палітык і кампазітар Міхал Клеафас Агінскі. Сёння ён найбольш вядомы сваім паланезам ля-мінор “Развітанне з Радзімай”, які шмат хто ў Беларусі хацеў бы чуць у якасці дзяржаўнага гімну краіны.

**8 кастрычніка** 1586 году ў Вільні выходзіць у свет першая друкаваная граматыка беларускае мовы. З’явілася яна ў друкарні Кузьмы і Лукаша Мамонічаў – “на просьбу жыхароў сталіцы Вялікага Княства Літоўскага”.

**9 кастрычніка** 1596 году ў Брэсце была абвешчана царкоўная унія. У імя адзінства народу і краіны праваслаўная і каталіцкая цэрквы Беларусі вырашылі аб’яднацца. Праваслаўная царква, захоўваючы сваю ерархію і абрады, прызнавала вяршэнства Папы рымскага і каталіцкую дагматыку. Усе багаслужбы і казані вяліся па-беларуску. Ужо ў 18 стагоддзі 75 % жыхароў Беларусі былі ўніятамі.

**10 кастрычніка** 1939 году Савецкі Саюз перадае Вільню Літве. Перад гэтым меркавалася зрабіць горад сталіцай Заходняй Беларусі. Аднак сталася па-іншаму. Узамен за Вільню Літва дазволіла размясціць на сваёй тэрыторыі савецкія вайсковыя базы.

# БЕЛАРУСАЎ ЗАГАНЯЮЦЬ У МОЎНЫ ТУПІК

## У САМОЙ РАСІІ ЎСЁ МЕНЕЙ РЭГІЁНАЎ ГАВОРАЦЬ ПА-РУСКУ

«Если мы забудем русский язык, — потеряем половину всего», — чарговы раз засведчыў свае прыярытэты кіраўнік Беларусі на нядаўняй прэсавай канферэнцыі. Але ўлюбёная Лукашэнкава мова паўсюль губляе свае пазіцыі і неўзабаве згубіць статус сусветнай.

Як піша часопіс «Русский Newsweek», былая мова міжнацыянальных зносінаў усё больш губляе папулярнасць у свеце.

Паводле прагнозаў Цэнтра дэмаграфіі і экалогіі чалавека (ЦДЭЧ) Інстытута народнагаспадарчага прагназавання Расійскай акадэміі навук, у 2025 годзе размаўляць па-руску будуць столькі ж людзей, колькі напачатку XX стагоддзя, і ў два разы менш, чым напярэдадні развалу СССР. Пасля гэтага ад імперыі, якая калісці, здавалася, паспяхова стварыла адзіны савецкі народ, застануцца толькі згадкі ў падручніках.

Пакуль што руская мова займае чацвёртае месца сярод найбольш распаўсюджаных моваў свету. Яе ведаюць блізу 278 мільёнаў чалавек. Сёння наперадзе толькі англійская (1,5 мільярды), кітайская (больш за 1,3 мільярды) і іспанская (335 мільёнаў). Аднак ЦДЭЧ сцвярджае, што ўжо праз 10 год рускую мову абгоняць французская, арабская і хіндзі, а яшчэ праз 15 – партугальская і бенгалі.

Ужо цяпер у былым СССР кожны чацвёрты не разумее па-руску ані слоўца. Руская мова найбольш патрэбная тым, хто ездзіць ў Расію на працу – мігрантам, легальным альбо не. Праз дзесяцігоддзі менавіта яны будуць складаць касцяк "рускамоўнага насельніцтва", пра якое так любяць клапаціцца расійскія патрыёты. Якія адначасова змагаюцца з наплывам гэтых самых мігрантаў у Расію: "понаехали тут". Жарты лёсу...

"У Расіі становішча, прыкладна, як у Галандыі, — тлумачыць Іван Беленькі, гісторык, які вывучае каланіяльны перыяд. – Праз стагоддзе ад ейнай прысутнасці на палове зямнога шару не застанецца і следу, як гэта здарылася са шматлікімі калоніямі той вялікай марской імперыі. Не надта адукаваныя людзі нават не ведаюць, што ў Галандыі былі калоніі – мова ж засталася толькі ў Сурынаме".

Між іншым, яшчэ 60 гадоў таму галандцам належала Інданэзія – краіна з насельніцтвам большым, як у Расіі. Цяпер там ніхто не жадае вучыць галандскую мову.

А самае дзіўнае тое, што руская мова паступова губляе носьбітаў і ў самой Расіі. У нацыянальных рэспубліках існуюць яшчэ 28 іншых дзяржаўных моў, і, як засведчыў апошні перапіс насельніцтва, рускую мову наогул не ведаюць 2,6 мільёна чалавек – галоўным чынам, жыхароў Паўночнага Каўказа. Паводле разлікаў Цэнтра дэмаграфіі, за 2 гады пасля перапісу колькасць носьбітаў расійскай мовы паменшылася яшчэ на паўтара мільёны – яны папросту памерлі. Заўважым, што насельніцтва Расіі скарачаецца менавіта за кошт рускіх абласцей. У тых рэгіёнах, дзе галоўную дзяржаўную мову не лічаць за родную, насельніцтва павялічваецца, дзякуючы вялікай нараджальнасці. Такім чынам, гадоў праз 10 у Расіі могуць з'явіцца рэгіёны, якія спрэс не гавораць па-руску.

Беларускія ж улады ўпарта пашыраюць сферу ўжывання "великого и могучего языка". Іхнымі намаганнямі цэлыя генерацыі заганяюцца ў моўны тупік. У выніку атрымліваецца, што значная частка беларусаў ні роднай мовы не ведае, ні якойсьці іншай, пашыранай у свеце. І застаецца ім адзін шлях – на Ўсход. Каб пайсці ў іншым кірунку, трэба мяняць прыярытэты. І найперш — моўныя.

**Валеры Філін**




*Чым ганарымся? Рэклама гарэлкі і аднайменных чыпсаў. Мінск, верасень 2006 году.*

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер" **Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by) **Тыраж** 299 экзэмпляраў